**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання**

# РАШЭННЕ

аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб’екта
і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвяржэнні спісаў выбарчых суб’ектаў

10 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ІІІ склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы зварот ад выбрачага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава”,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

9 траўня 2024 года ў Выбарчую камісію пастуціў ліст ад ініцыятара спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава” Паўла Патапава, у якім утрымліваецца просьба выключыць са спісу выбарчага суб’екта кандыдата пад нумарам 32 Яраслава Гамолку.

У адпаведнасці з пп. 7.1 пункта 7 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года, 7.1., калі пасля завяршэння рэгістрацыі з спіса выбарчага суб’екта выбывае кандыдат, выбарчы суб’ект павінен паведаміць аб гэтым у Камісію з цягам 1 дня. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што кандыдат Яраслаў Гамолка выбыў са спіса выбарчага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава”, у сувязі з чым дадзены кандыдат мусіць быць выключаны са спісу.

На падставе вышэй выкладзенага, Выбарчай камісіяй

## ВЫРАШАНА:

Кандыдата спіса выбарчага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава” Яраслава Гамолку пад нумарам 32 - са спісу выключыць.

Унесці адпаведныя змяненні ў Пастанову аб зацвяржэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька